## *тэма:* Беларуска-літоўскія летапісы XV ст.

1 *Палітычнае адзінства і магутнасць Вялікага Княства Літоўскага ў беларуска-літоўскім летапісанні XV ст.*

2 *“Летапісец вялікіх князёў літоўскіх” як адзін з першых твораў беларускай гістарычна-дакументальнай прозы.*

3 *“Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г.”: спісы летапісу, структура і крыніцы помніка.*

# “Летапісец вялікіх князёў літоўскіх” як адзін з першых твораў беларускай гістарычна-дакументальнай прозы.

- ***“Летапісец...”*** быў прысвечаны апісанню палітычнай гісторыі Літвы, Беларусі і Украіны XIV – пачатку XV ст., гісторыі напружанай барацьбы за ўладу паміж нашчадкамі князя Гедыміна (1316–1341), барацьбы за палітычнае аб’яднанне ўсходнеславянскіх зямель, чаго вымагалі гістарычныя абставіны.

- Твор напісаны не ў традыцыйнай пагадовай форме, а як звязная гістарычная аповесць.

# “Летапісец вялікіх князёў літоўскіх” як адзін з першых твораў беларускай гістарычна-дакументальнай прозы.

- У ім даследчыкі вылучаюць 3 часткі:
- ***1-ая частка*** прысвечана жорсткай, бескампраміснай, драматычнай барацьбе паміж князямі *Ягайлам* Альгердавічам (які пасля смерці ў 1377 г. бацькі стаў вялікім князем літоўска-беларускім) і яго дзядзькам *Кейстутам* Гедымінавічам.
- Гісторыя барацьбы Кейстута з Ягайлам выкладзена ў «Летапісе» ёмка, дакладна, дынамічна і выразна.
- Твор дадаткова ажыўляюць каларытныя дыялогі, простая мова герояў.
- Сімпатыі аўтара цалкам на баку Кейстута і Вітаўта, якія намаляваны з яўным спачуваннем як сумленныя і высакародныя рыцары ў супрацьвагу здрадліваму, няўдзячнаму і бязлітаснаму Ягайлу.
- Як паказвае змест, агульная накіраванасць, мова і стыль твора, першапачатковая частка «Летапісу» напісана ў свецкім асяроддзі, блізкім да князя Вітаўта, дзесьці ў канцы XIV ст. з мэтай гістарычна абгрунтаваць права гэтага князя на вялікакняжацкі пасад у Вільні, апраўдаць яго паводзіны ў той міжусобнай спрэчцы і асудзіць перад гісторыяй Ягайлу, забойцу Кейстута.

# “Летапісец вялікіх князёў літоўскіх” як адзін з першых твораў беларускай гістарычна-дакументальнай прозы.

- ***2-ая частка*** ўяўляе сабой шэраг асобных гістарычных апавяданняў пра самыя розныя падзеі:
- пра жаніцьбу і каранацыю ў Кракаве князя Ягайлы,
- пра бітву літоўскіх князёў са смаленскімі пад Мсціславам,
- пра выдачу замуж дачкі князя Вітаўта Софіі за маскоўскага князя Васіля Дзімітравіча,
- пра загадкавую смерць у Кіеве князя Скіргайлы і інш.
- Галоўным героем твора становіцца ***Вітаўт***. Апісанне яго настойлівых спроб дасягнуць вялікакняжацкага трона ў Вільні (*дамогся ў 1392 г., калі Ягайла, на той час ужо кароль Польшчы, вымушаны быў аддаць яму вярхоўную ўладу ў ВКЛ*) і бурнай дзейнасці ў першыя гады яго самастойнага панавання ў гэтай дзяржаве складае асноўны змест другой часткі «Летапісу».
- ***Вітаўт*** робіць паходы на Віцебск, Смаленск, Украіну,
- пазбаўляе ўлады непакорлівых мясцовых князёў,
- далучае да ВКЛ ускраінныя беларускія і ўкраінскія землі, умацоўвае іх палітычнае адзінства.

## “Летапісец вялікіх князёў літоўскіх” як адзін з першых твораў беларускай гістарычна-дакументальнай прозы.

- Як прадстаўнік перадавых грамадскіх сіл Літвы і Русі канца XIV – пачатку XV ст. *беларускі летапісец* апісвае і ацэньвае падзеі з *агульнадзяржаўных* пазіцый.
- Ён ухваляе збіральніцкую, цэнтралізатарскую палітыку Вітаўта, *узвышэнню якога, сцвярджае аўтар, была рада «ўся зямля Літоўская і Руская».*
- ***2-ая частка*** «Летапісу» напісана кніжным стылем старабеларускай літаратурнай мовы таго часу, прыкладна каля 1430 г. у Смаленску ў асяроддзі мясцовага праваслаўнага духавенства, якое падтрымлівала аб'яднальную палітыку літоўска-беларускіх князёў на Русі.

## “Летапісец вялікіх князёў літоўскіх” як адзін з першых твораў беларускай гістарычна-дакументальнай прозы.

- ***3-ая частка*** – невялікая аповесць пра Падолле, у якой выкладзена палітычная гісторыя Падольскай зямлі за другую палову XIV – першую трэць XV ст.
- Асабліва падрабязна апавядаецца пра лёс чатырох сыноў Карыята Гедымінавіча, князя навагрудскага, пасланых на Падолле пасля вызвалення яго ад ардынскага іга вялікім князем Альгердам (1345–1377).
- Аповесць пра Падолле напісана па-дзелавому сцісла і лагічна, вылучаецца чыста свецкім зместам і стылем, публіцыстычнай завостранасцю і гучыць як палітычны дакумент часу, складзены з мэтай гістарычна абгрунтаваць правы Літоўска-Беларускай дзяржавы на гэтую зямлю і асудзіць захопніцкія імкненні Польшчы.
- Твор узнік у пачатку 30-х гг. XV ст. у асяроддзі патрыятычна настроеных беларуска-літоўскіх феадалаў, якія цвёрда стаялі на варце сваіх класавых і агульнадзяржаўных інтарэсаў ВКЛ, горача абаранялі яго тэрытарыяльную цэласнасць і суверэнітэт перад экспансіянісцкім наступам польскіх правячых колаў.

# “Летапісец вялікіх князёў літоўскіх” як адзін з першых твораў беларускай гістарычна-дакументальнай прозы.

- **ВЫСНОВЫ:**
- «Летапіс вялікіх князёў літоўскіх» — *неаднародны* літаратурны помнік.
- У ім аб'яднаны блізкія паводле агульнай накіраванасці, але даволі розныя сваім характарам творы розных аўтараў: аповесць пра Кейстута, няскончаная гісторыя княжання Вітаўта і аповесць пра Падолле.
- «Летапіс» – вельмі цікавы і арыгінальны, своеасаблівы па жанравай форме летапісны твор, каштоўная крыніца пазнання далёкага мінулага нашай Бацькаўшчыны.
- Ён стаў новым этапам у развіцці летапіснага жанру на беларускіх землях, у станаўленні беларускай літаратуры.
- Быў самым раннім гістарычна-літаратурным творам, напісаным па-беларуску з новых ідэйна-мастацкіх пазіцый.
- У ім рашуча пераадолена традыцыйная, летапісная форма апісання гісторыі і зроблена першая ўдалая спроба стварыць звязнае, прагматычнае апавяданне аб мінулым.
- Твор стымуляваў з'яўленне новых летапісаў і хронік, уваходзіў ва ўсе наступныя беларуска-літоўскія летапісныя зводы і аказаў дабратворны ўплыў на далейшае развіццё агульнадзяржаўнага летапісання ў ВКЛ.

# “Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г.”: спісы летапісу, структура і крыніцы помніка.

- У некаторых рукапісных гістарычных зборніках XV–XVI ст. захаваўся летапіс, у якім спачатку сцісла выкладзена 1) гісторыя Старажытнай Русі IX–XIII ст., 2) пасля Маскоўскага і Літоўска-Беларускага княстваў за XIV–першую палову XV ст., 3) а ў самым канцы змешчаны «Летапіс вялікіх князёў літоўскіх».
- Гэта і ёсць першы беларуска-літоўскі ***летапісны звод***, названы інакш яшчэ **Летапісам 1446 г.**, бо гэтым годам датуецца ў ім апошні запіс.

# “Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г.”

- Гісторыя ўзнікнення Кіеўскай дзяржавы, жыццё і дзейнасць першых рускіх князёў ад Рурыка да Яраслава Мудрага, нялёгкая праца па ўмацаванні палітычнага адзінства і магутнасці Русі, барацьба нашых продкаў з іншаземнымі захопнікамі за незалежнасць, шматлікія паходы і бітвы, найважнейшыя моманты з гісторыі рускай царквы – такі асноўны змест **1-й часткі** гэтага летапісу, запазычанай з рускіх летапісаў.
- Гісторыя Старажытнай Русі выкладзена лаканічна, у форме кароткіх пагадовых запісаў-паведамленняў пра найбольш значныя падзеі грамадска-палітычнага жыцця ўсходніх славян.

# “Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г.”

- У канцы агульнарускай часткі Беларуска-літоўскага летапісу 1446 г., непасрэднай крыніцай якой быў маскоўскі летапіс мітрапаліта Фоція (к. 20-х гг. XV ст.), змешчаны шэраг цікавых звестак па гісторыі ВКЛ (пра паходы Вітаўта на Смаленск у 1395 і 1404 гг., пра бітвы з татарамі на р. Ворскла ў 1399 г. і з нямецкімі крыжакамі пад Грунвальдам у 1410 г. і інш.).
- Апрача гэтых апавяданняў, якія выпісаны з рускай крыніцы даволі поўна і дакладна, у цэлым рускі летапіс быў значна перапрацаваны беларускімі летапісцамі.
- Яго тэкст моцна скарочаны і месцамі адрэдагаваны, аднак не перакладзены на старабеларускую мову, а змешчаны ў арыгінале.

# “Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г.”

- Паміж часткай, запазычанай з рускіх летапісаў, якая канчаецца кароткімі запісамі пра падзеі 1427 г. у Маскоўскай Русі, і «Летапісам вялікіх князёў літоўскіх» у Беларуска-літоўскім летапісе 1446 г. змешчаны шэраг гістарычна-літаратурных матэрыялаў мясцовага паходжання.
- Найбольш цікавыя і каштоўныя сярод іх:
- «Пахвала вялікаму князю Вітаўту»,
- апавяданне пра паўстанне «чорных людзей» у Смаленску,
- аповесць пра грамадзянскую вайну ў Вялікім княстве Літоўскім, якая інакш называецца яшчэ Смаленскай хронікай, бо, хутчэй за ўсё, складзена ў Смаленску ў 30-я гг. XV ст.

# “Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г.”

- У Смаленскай хроніцы, напісанай у звязнай форме, але суха, інфармацыйна, дзелавой моваю, выкладаецца гісторыя дынастычнай барацьбы за ўладу пасля смерці Вітаўта паміж князямі Свідрыгайлам Альгердавічам і Жыгімонтам Кейстутавічам, якая скончылася перамогай апошняга.
- Ва ўступе коратка расказваецца пра няўдалую каранацыю Вітаўта (1430 г.), які вырашыў зрабіць ВКЛ цалкам незалежным ад Польшчы каралеўствам, *аднак яго «неприятели поляне (палякі) не пропустиша коруны», якую везлі ў Вільню.*
- Хаця большасць беларускіх феадалаў таго часу спачатку падтрымлівала Свідрыгайлу, летапісец не хаваў сваіх сімпатый да Жыгімонта.
- Аўтарам Смаленскай хронікі, найбольш верагодна, быў нехта з духавенства, што акружала мітрапаліта Герасіма.

# “Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г.”

- *Апавяданне пра паўстанне «чорных людзей»* у Смаленску прысвечана апісанню выступлення смаленскіх рамеснікаў, простага люду супраць смаленскага ваяводы, літоўскага стаўленіка ***Андрэя Саковіча***.
- У 1440 г. у Троках у выніку змовы быў забіты вялікі літоўскі князь Жыгімонт Кейстутавіч, брат Вітаўта.
- З мэтай не дапусціць у часы безуладдзя аддзялення Смаленскай зямлі ад Вялікага княства Літоўскага ваявода ўзяў у смалян прысягу на вернасць яму і Вільні. Аднак неўзабаве смаляне парушылі прысягу, узброіліся, выгналі Саковіча і яго прыхільнікаў, а ваяводам выбралі князя Андрэя Дарагабужскага. Пасля вяртання з Ноўгарада Юрыя Лугвеніевіча, князя мсціслаўскага, смаляне запрасілі яго княжыць у свой горад.

# “Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г.”

- «***Пахвала вялікаму князю Вітаўту***» вылучаецца сярод іншых частак «Бел.-літ. летапісу 1446 г.» характарам зместу і выкладу, жанравай формай і стылем.

Аўтар «**Пахвалы…**»:

- ўслаўляе князя як мудрага і ўсемагутнага валадара, даносіць да чытача сваё ўяўленне пра яго веліч і славу.
- гаворыць пра агромністы палітычны ўплыў Вітаўта ў Еўропе, пра яго вялікі міжнародны аўтарытэт.
- сцвярджае, што ўсемагутны Вітаўт узводзіў на трон і пазбаўляў улады татарскіх ханаў у грознай Залатой Ардзе і фактычна валодаў «усёй Рускай зямлёю».
- «***Пахвала Вітаўту***» – цікавы і каштоўны помнік літаратуры і грамадска-палітычнай думкі Беларусі перш. паловы XV ст.
- У ёй у сціслай форме выказана гістарычная канцэпцыя ўсяго “Бел.-літ. летапісу 1446 г.”, яго асноўная ідэя – погляд на ВКЛ як на *літоўска-славянскую дзяржаву*, якая прызнаецца галоўным цэнтрам палітычнага аб'яднання ўсходнеславянскіх зямель.

# “Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г.”

- **ВЫСНОВЫ:**
- Злучыўшы ў адным летапісным зводзе «Летапіс вялікіх князёў літоўскіх» і іншыя мясцовыя творы з матэрыяламі, узятымі з рускіх летапісаў, беларускі летапісец, т. ч., выклаў мінулае Літвы і Беларусі ў цеснай сувязі з гісторыяй іншых рускіх зямель і ў пераемнасці з гісторыяй Кіеўскай Русі.
- Гэтым самым гісторыю роднай краіны ён разглядаў як арганічную частку гісторыі ўсіх усходніх славян, сцвярджаў ідэю іх гістарычнай еднасці і абгрунтоўваў неабходнасць і заканамернасць палітычнага аб'яднання літоўскіх, украінскіх і рускіх зямель у адной дзяржаве – Вялікім княстве Літоўскім і Рускім.
- Апрача таго, у Беларуска-літоўскім летапісе 1446 г. упершыню зроблена спроба асэнсаваць і раскрыць выдатную ролю гэтай дзяржавы ў гісторыі Еўропы.

# “Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г.”

- Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г. неаднародны па складзе, надзвычай багаты паводле зместу і ідэйнай накіраванасці помнік.
- У яго аснове ляжыць летапісны звод, складзены каля 1430 г., які пасля дапаўняўся запісамі да 1446 г. уключна.
- Яго ўзнікненне звязана з дзейнасцю вялікага князя Вітаўта і вядомага царкоўна-рэлігійнага і культурнага дзеяча таго часу смаленскага епіскапа (у 1432–1435 гг. мітрапаліта) Герасіма, актыўнага прыхільніка і выразніка агульнарускіх імкненняў гэтага князя.